14. *Szacki J.* świadomość historyczna a wizja przyszłości // Dylematy historiografii idei oraz inne szkice i studia. Warszawa, 1991. S. 266–284.
15. Zdanie o obieraniu nowego króla // Pisma polityczne z czasów pierwszego bezkrólewia / Wyd. J. Czubek. Kraków, 1906. S. 349–355.

# МАГІСТРАТ ГОРАДА ДЗІСНЫ Ў XVI–XVIII СТСТ.

**А. В. Грыб**

Горад Дзісна ў XVI–XVIII стст. – сярэдні па памерах гандлёвы гарадок. Яго насельніцтва вагалася ў межах 2–3 тысяч чалавек (для параўнання: сучаснае насельніцтва – каля 2,5 тыс.). Мяшчане займаліся пераважна гандлем з Рыгай (вывозілі лён, каноплі, пяньку, лес, паташ і інш. сыравіну). У горадзе было добра развіта рамяство: існавала 9 цэхаў, акрамя цэхавых майстроў была вялікая колькасць прафесій, якія з-за малалікасці не маглі ўтварыць цэха [1, р.165]. Першапачаткова горад утварыўся каля замку, які быў пабудаваны ў 1560-х гадах на месцы старажытнага гарадзішча Полацкага княства. Замак найбольшай магутнасці дасягнуў пры каралі Стэфане Баторыі, які перад паходам на Полацк у 1579 г. збіраў войска пад Дзіснай. Замак не захаваўся да нашага часу, ён быў узарваны шведамі ў часе Паўночнай вайны.

Гарадское самакіраванне ў Дзісне ажыццяўлялася на аснове магдэбургскага права, падобна да таго, як кіраваліся іншыя гарады ў ВКЛ. Прынцыпы самакіравання закладваліся ў прывілеях гораду на магдэбургскае права. Першы прывілей на магдэбургскае права быў нададзены 20 студзеня 1569 года на сойме ў Любліне. У ім дакладна агаворвалася пра гарадскія ўрады, прыбыткі магістрату, правы і абавязкі мяшчан адносна вялікакняскага скарбу [2, р.226–230; 3, с.164–169]. Кожны наступны манарх пацвярджаў усе гэтыя палажэнні праз выданне канфірмацыйнага прывілея. Акрамя прывілея на магдэбургскае права былі выяўлены іншыя прывілеі дзісненскім мяшчанам, якія паступова ўключаліся ў канфірмацыйныя прывілеі [4, арк.10адв.–18адв.]. Усе прывілеі выдаваліся на неабмежаваны час («на вечнасць») каралём, які лічыўся намінальным уласнікам горада.

Магістрат горада Дзісны складаўся з рады і лавы. Дакладна невядома, ці быў гэты падзел пастаянны, ці гэтыя палажэнні змяняліся цягам часу. Устаноўлена, што большасць выракаў магістрацкага суду і іншыя рашэнні магістрату звычайна складаліся ў прысутнасці бурмістраў, радцаў і лаўнікаў. З гэтага можна зрабіць выснову, што ў дзісненскім магістраце большасць паседжанняў адбывалася сумесна з удзелаў і рады, і лавы. Калі ўлічыць, што Дзісна была невялікім горадам, то верагодна,

што для рацыянальнага кіравання дастаткова было аднаго органа самакіравання, які б займаўся і цывільнымі, і крымінальнымі справамі.

Главой горада быў войт, які адначасова з'яўляўся старастам дзісненскага староства. Сумяшчэнне ўрадаў прывяло да таго, што пасада войта стала толькі намінальнай, а гарадскімі справамі сам войт не займаўся. Горадам кіраваў намеснік войта – лантвойт. Мяшчане абіралі чатырох кандыдатаў на гэты ўрад, з якіх войт зацвярджаў аднаго [2, p.227–228]. Лантвойт узначальваў лаву і сумесныя паседжанні магістрату. Таксама лантвойт вырашаў скаргі на дзеянні магістрату. Напрыклад, у 1644 годзе да лантвойта была пададзена скарга дзісненскіх мяшчан на магістрат [5, с.194–195].

У склад магістрату ўваходзілі бурмістры, якія былі галоўнымі ураднікамі, кіравалі радай (тады, калі яна выступала як асобны орган). Колькасць бурмістраў не была дакладна вызначана ў прывілеі на магдэбургскае права, але звычайна бурмістраў было два – адзін з «рукі рымскай», другі з «рукі грэцкай». Гэта значыць, што па веравызнанні адзін з бурмістраў павінен быў з'яўляцца каталіком ці ўніятам, а другі праваслаўным. Жыхары горада іншых веравызнанняў (іудзеі, магаметане і пратэстанты) да кіравання горадам не дапускаліся. Былі часы ў дзейнасці дзісненскага магістрату, калі адзін з бурмістраў з'яўляўся віцэ-лантвойтам (намеснікам лантвойта) [9, арк.93], тады агульная колькасць бурмістраў складала тры асобы.

Разам з бурмістрамі свае абавязкі выконвалі радцы. Яны былі амаль роўныя бурмістрам, але не мелі права кіраваць паседжаннямі магістрату. Звычайная колькасць радцаў у Дзісне была тры асобы [6, арк.261].

Лаўнікі ўваходзілі ў склад лавы. Пры адсутнасці лавы (сумесных паседжаннях) лаўнікі ўваходзілі ў склад магістрата, ўдзельнічалі ў выпрацоўцы рашэнняў, але звычайна ў дакументах пайменна не ўзгадваліся [9, арк.43, 55].

Лантвойт, бурмістры, радцы і лаўнікі складалі выбарную частку магістрату. Яны абіраліся мяшчанамі па чатыры кандыдаты на ўрад, а войт зацвярджаў патрэбную колькасць ураднікаў [2, p.228]. Звычайнай справай у магістраце быў кар'ерны рост. Каб дасягнуць пасады бурмістра, большасць асоб пачыналі з ураду лаўніка, праз некалькі гадоў маглі стаць радцам, і ўжо затым праз нейкі час выбраліся на бурмістраўскі ўрад. Хаця вядомы і іншыя выпадкі, калі некаторыя мяшчане станавіліся бурмістрамі без вопыту радзецтва і лаўніцтва. Напрыклад, пісар Ян Дубіна ў 1741 годзе быў выбраны бурмістрам адразу з пісарскага ўраду без праходжання прыступак лаўніка і радцы [9, арк.446].

Важным для абрання ў склад магістрату была прыналежнасць да багацейшых мяшчанскіх сем'яў Дзісны. Найчасцей на выбарныя ўрады абіраліся члены сямей Клыпаў, Сушчэвічаў, Крывейкаў, Грыбоў, Савічаў, Шыбайлаў, Барадульскіх і некаторых іншых. Паколькі ураднікі належалі да багачоў, то ім за знаходжанне на ўрадзе не плацілі. Аднак, ураднікі не заставаліся ў пройгрышу: сам удзел у працы магістрату даваў шмат магчымасцей для правядзення выгадных ім рашэнняў, часам ураднікі прысвойвалі гарадскія сродкі. Вядомы выпадкі, калі за злачынства супраць гарадскога ўрадніка каралі больш жорстка, чым за злачынства супраць шэраговага мешчаніна .

Акрамя выбарных урадаў у магістраце былі і ўраднікі «па змове». Па-першае, гэта пісар, чалавек, які вёў усё справаводства магістрату. Яго штодзённая праца дазволіла нам карыстацца актавымі кнігамі дзісненскага магістрату. Кожны пісар меў свой стыль, свой почырк і асаблівасці запаўнення актавых кніг. Дакладныя ўмовы знаходжання пісара на ўрадзе невядомы. Верагодна, ён атрымліваў грошы за працу з дакументамі, яго заробак залежаў ад колькасці і якасці напісаных лістоў. У 1-й пал. XVIII ст. пісарамі былі прадстаўнікі адной сям'і – Дубінаў: Міхал, Ян і Лявон [6, арк.261; 8, арк.1а; 9, арк.410а; 7, арк.316адв.].

У склад магістрату ўваходзілі шафары, якія займаліся фінансавымі пытаннямі: збор падаткаў, кантроль за грашовымі сродкамі, у тым ліку іх улік і выкарыстанне. Атон Гедэман, польскі даследчык, лічыць, што зборам падаткаў у Дзісне займаліся бірчыя, а шафары займаліся толькі кансультацыямі па фінансавых пытаннях [1, р.252]. З гэтым нельга пагадзіцца: фактычна шафары і бірчыя займаліся адной і той жа справай, але ва Усходняй Беларусі (Падняпроўе і Падзвінне) фінансавыя ўраднікі зваліся бірчымі, а ў Цэнтральнай і Заходняй Беларусі – шафарамі. У Дзісне сустракаліся абедзве назвы гэтага ўраду.

Значна больш інфармацыі захавалася пра ўрад слугі мейскага. Вядома, што слуга мейскі пры магістраце (аналагічна быў яшчэ і слуга лантвойтаўскі пры лаве) займаўся разносам пазваў, рэгістрацыяй на месцы абставінаў крымінальных спраў, іншымі паліцэйскімі функцыямі. Таксама вядомы сумы грошай, на якія дамаўляўся магістрат з кандыдатамі на гэты ўрад. У к. XVII – пач. XVIII ст. слузе мейскаму плацілі ад 16 да 28 коп, акрамя таго ён атрымліваў службовую вопратку: кажух, шапку, дзве пары ботаў і рукавіцы [6, арк.107адв., 247; 8, арк.106, 202адв.].

У выніку працы магістрату ўтварыліся своеасаблівыя крыніцы: магістрацкія кнігі. На дадзены момант вядома 16 актавых кніг, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) і

ўтвараюць асобны фонд 1757 «Дзісненскі магістрат». Мной былі распрацаваны чатыры кнігі з гэтага фонду, якія ахопліваюць перыяд за 1696–1741 гг. [6, 7, 8, 9]. У іх утрымліваюцца звесткі пра склад магістрату, разглядаемыя на яго паседжаннях справы, выракі магістрацкіх судоў, дакументы, якія падаваліся ў магістрат для зацвярджэння (напрыклад, тэстаменты, купчыя, арэнды), звесткі па генеалогіі, гісторыі паперы, палеаграфіі і іншых спецыяльных гістарычных дысцыплінах. Гэта важная крыніца перш за ўсё для лакальнай гісторыі, але значэнне гэтых крыніц цяжка пераацаніць для гісторыі ўсёй краіны.

Калі падвесці вынікі да ўсяго вышэйадзначанага, то можна выдзеліць наступнае: горад Дзісна адносіўся да сярэдніх гарадоў, што праявілася і ў дзейнасці магістрату (ён з'яўляўся прамежкавым паміж магістратамі буйных і дробных гарадоў); магістрат фарміраваўся з прадстаўнікоў багацейшых сем'яў, якія ледзь не перадавалі ўрады ў спадчыну; захаваліся крыніцы па гісторыі дзейнасці дзісненскага магістрату – актавыя кнігі, з якіх можна атрымаць шмат інфармацыі пра разнастайныя аспекты жыцця горада Дзісны ў XVIII ст.

## Літаратура


1. *Hedemann O.* Dzisna i Druja: magdeburskie miasta. Wilno, 1934.
2. Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 51 (1566–1574) / Lietuvos istorijos institutas. Vilnius, 2000.
3. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Санкт-Петербургской археографической комиссией. / Под ред. Н.И.Костомарова. Т.1 (1361–1598). СПб., 1863.
4. НГАБ, КМФ-18, спр. 152.
5. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. / Предисл. П. Гильтебрандта. Т. 4. Вильна, 1867.
6. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 2.
7. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 3.
8. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 4.
9. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 5.


# РЭСТЫТУЦЫЯ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ. ГІСТАРЫЧНЫЯ І ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ


**К. М. Дубіцкая**


Рэстытуцыя – форма матэрыяльнага аднаўлення нанесенай шкоды культурным каштоўнасцям у выніку неправамернага міжнароднага акта шляхам аднаўлення стану, які існаваў да яго здзяйснення. Адбываецца